2 Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў: у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 2 т. : М–Я. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

***В. А. Барадзін***
*Навук. кір.* ***А. М. Ермакова,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## КАНЦЭПТЫ *ЖЫЦЦЁ* І *СМЕРЦЬ* У АПАВЯДАННІ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА «РУСКІ»

У сучаснай навуцы ўсё часцей сустракаецца перакрыжаванне лінгвістыкі і літаратуразнаўства. Гэта звязана з працэсам вывучэння мастацкага тэксту з пункта погляду светабачання і светаўспрымання аўтара. Асновай для вывучэння моўнай карціны свету з'яўляюцца канцэпты. Пад канцэптам мы разумеем сукупнасць уяўленняў і асацыяцый, якія звязваюцца з пэўным словам і кансалідуюцца ў свядомасці чалавека. А мова з'яўляецца адным са спосабаў фарміравання канцэптаў у свядомасці чалавека. На прыкладзе апавядання «Рускі» М. Гарэцкага мы будзем разглядаць вербальную рэалізацыю канцэптаў *жыццё* і *смерць*.

Падчас чытання метадам суцэльнай выбаркі выпісваем словы, якія маюць у сваёй семантычнай структуры сему *жыццё* і рэалізуюць канцэпт *жыццё*: *хворы* (чалавек, жыццё якога ўскладнена хваробай) – *«А таму **хвораму** на грудзі салдату-беларусу, што прывезлі з аўстрыйскага фронту, болей выпадае ляжаць у бальніцы для **нервовахворых**, чым тут, у нас»* [1]; *нервовахворы* (чалавек, які жыве з нервовай хваробай); *гаротнік* (чалавек, які пастаянна жыве ў горы); *му́ка* (жыццё ў фізічных або маральных пакутах); *безнадзейнасць* (становішча ў жыцці, калі адсутнічае надзея; безвыходнасць); *боль* (жыццё з адчуваннем фізічнай або маральнай пакуты); *хвароба забірае* (гвалтоўна пазбаўляе чалавека нармальнай жыццядзейнасці) і інш.

**ЖЫЦЦЁ**, *-я́, н.* Ажыўленне, праяўленне дзейнасці, энергіі [2, с. 252]. Канатацыя станоўчая. А вось у тэксце М. Гарэцкага лексема выяўляе адмоўную ацэначнасць, гэта добра відаць пасля поўнага аналізу кожнай лексічнай адзінкі.

Канцэпт *смерць* рэалізуецца з дапамогай наступных лексічных адзінак (якія маюць у сваёй семантычнай структуры сему *смерць*): *забіты* (чалавек, які сустрэў смерць. Яго забілі) – «***Забіты*** яшчэ раз пацягнуўся, замкнуў паволі вочы і ***быў гатоў***» [1]; *смяротная пялёнка* (выступае ў ролі паказчыка завяршэння жыцця – смерці чалавека); *забіць* (пазбавіць чалавека жыцця; амярцвіць яго).

Такое пашырэнне адмоўнай канатацыі лексічных адзінак, якія рэалізуюць канцэпты *жыццё* і *смерць* у творы, дапамагае зразумець задуму аўтара: паказаць цяжкасць жыцця і выбару падчас вайны.

Канцэптуальны аналіз мастацкага твора – задача вельмі няпростая. Аўтар у сваіх творах адлюстроўвае індывідуальную карціну свету. І мастацкі канцэпт, які базіруецца на этнакультурных уяўленнях, выступае таксама як сукупнасць моўных і ментальных структур мастацкага свету пісьменніка і адлюстроўвае індывідуальнае светабачанне.

### Літаратура

1 Гарэцкі, М. «Рускі» [Электронны рэсурс] / М. Гарэцкі. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Maksim_Harecki/Ruski.html. – Дата доступу : 01.04.2021.

2 Капылоў, І. Л. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад. : І. Л. Капылоў [і інш.] : пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ